ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДАК "ДЗЕДЗІЧ"

# ДЗЕДЗІЧ

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

№ 2 (10)

КРАСАВІК 2001

2 ЧАМУ Я ЎДЗЕЛЬНІЧАЮ Ў СЕМІНАРАХ? ХА! Тыповы Дзедзіч

3 НАША СІЛА - Ў ЯДНАННІ

4 КАШЧЭЙ БЕССМЯРОТНЫ СУПРАЦЬ ЧАХЛІКА НЕЎМЯРУЧАГА

5 ГІСТОРЫЯ РОБІЦЦА СЁННЯ. НА ТВАІХ ВАЧАХ.

# Мы зноў разам

ВОСЬ І ПАБАЧЫЎ СВЕТ ЧАРГОВЫ НУМАР "ДЗЕДЗІЧА". НЕКАТОРЫЯ, МАБЫЦЬ, УЖО ЗАБЫЛІСЯ НА НАС, ІНШЫЯ – АДЧАІЛІСЯ ДАЧАКАЦЦА. А МЫ ПРОСТА МНОГА ПРАЦАВАЛІ, І НА ПАДРЫХТОЎКУ НУМАРУ НЕ ХАПАЛА ЧАСУ. ДА ТАГО Ж БЫЛІ І ІНШЫЯ ПРЫЧЫНЫ, ЯКІЯ АД НАС НЕ ЗАЛЕЖАЛІ, ЗВЯЗАНЫЯ З АГУЛЬНЫМ РОСТАМ КРЫМІНАГЕННАСЦІ Ў КРАІНЕ.

Сённяшні нумар - юбілейны. Мы адзначаем гадавіну выхаду першага нумару «Дзедзіча», да якой прымеркавалі новы дызайн.

За гэты час у клубе адбылося шмат цікавых падзей, і не маючы магчымасці распавесці пра кожнае падрабязна, мы асвятлім найбольш значныя:

**1.** Самае важнае – у нас нарэшце з'явілася памяшканне, дзе можна збірацца, абмяркоўваць планы, працаваць і адпачываць! Офісам гэта не назавеш, але на бліжэйшы час нас задавальняе і двухпакаёвая кватэра ў самым цэнтры горада: **вул. Карбышава, 112, к. 4.** ¨сць у нас ужо і кампутары, выхад у інтэрнэт, факс.

Увесь люты і палову сакавіка мы ўладкоўваліся на новым месцы. Цяпер мы – адна з нешматлікіх моладзевых арганізацый, што маюць сваё памяшканне, тэхніку, якую-ніякую бібліятэку і відэатэку.

**2.** Мы адзначылі самае галоўнае свята жанчын – 8 сакавіка і самае галоўнае свята Беларусі – Дзень Волі 25 сакавіка. Кожны, хто ў гэты дзень шпацыраваў па гарадскім парку і вуліцы Савецкай, мог атрымаць ад нас 10 сапраўдных беларускіх талераў з юбілейнай серыіі, прымеркаванай да 83-годдзя абвяшчэння Беларускай народнай рэспублікі.



**«Дзякуй, я лепш вазьму кветачкі». Дзедзіч віншуе сваю прыгожую палову са святам**

**(працяг на стар. 5)**

# НОВЫ ІМІДЖ – ДАГАРЫ НАГАМІ

## БЕРАСЦЕ СТАЛА ПАЛІГОНАМ ДЛЯ АДПРАЦОЎКІ НОВЫХ МЕТАДАЎ СУПРАЦІВУ

2 красавіка 2001 г. адзначалася 5-годдзе падпісання саюзнай дамовы паміж Беларуссю і Расеяй.



Можна па рознаму ставіцца да гэтай падзеі, ругаць здраднікаў Радзімы альбо бурчаць аб "низких темпах интеграции", але пакінуць "дзень яднання брацкіх народаў" без увагі было проста немагчыма – на кожным кроку мы сустракалі на вуліцах Берасця сваеасаблівыя паведамляльныя знакі, якія проста прымушалі нас узгадаць чарговую эпахальную веху ў нашай шматвекавой дружбе. Гэта былі звычайныя атрыбуты кожнага афіцыйнага мерапрыемства – дзяржаўныя сцягі "Белоруссии" і дзе-нідзе Расейскай Федэрацыі, якія віселі літаральна на кожным вуглу.

На вялікае шчасце сярод тых, хто вывешваў у гэты дзень святочныя ўпрыгожванні, знайшліся не толькі прыхільнікі Саюза, але і тыя, хто выступае супраць знішчэння дзяржаўнага суверэнітэта Рэспублікі Беларусь. Да ліку апошніх з упэўненасцю можна аднесці супрацоўнікаў Берасцейскага дзяржаўнага універсітэта, якія ў наш складаны час, калі не ў кожнага хапае смеласці проста мець свае ўласныя перакананні, не пабаяліся выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, павесіўшы дзяржаўны сцяг дагары нагамі. Дарэчы ў такім выглядзе сцяг правісеў увесь дзень і ніхто нават не звярнуў увагі на такі дзёрзкі ўчынак невядомых патрыётаў. Ці ж не гэта галоўны паказчык стаўлення беларусаў як да палітыкі сучаснага кіраўніцтва, так і да яго сімволікі! А ўлічваючы тое, што такія ўчынкі ў нашым горадзе з'ява не адзінкавая (напрыклад, мне давялося бачыць тое ж самае над дзвярыма СШ №13 падчас выбараў 15 кастрычніка і паўторных 18 сакавіка), то можна з упэўненасцю казаць пра рост новай формы супраціву аўтарытарнаму рэжыму, якую можна толькі вітаць за яе арыгінальнасць, прастату і шчырасць!

**P.S.** У іншыя часы за такія рэчы расстрэльвалі без суда і следства. А ў нас – нават не звяртаюць увагі. Вось што значыць беларуская дэмакратыя!

**P.P.S.** А, здаецца, ён так нават прыгажэй глядзіцца. Можа так і пакінуць?

**Б. Дэпеша**

# ДА ВЫБАРАЎ НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЗАСТАЛОСЯ 165 ДЗЁН

## ЗВАРОТ ДА БЕРАСЦЕЙСКАЙ МОЛАДЗІ

Як вядома, 2001 год - год прэзідэнцкіх выбараў у нашай краіне.

Згодна Канстытуцыі яны павінны адбывацца кожныя 5 гадоў, але гэтыя выбары нам давялося чакаць 7 гадоў – доўгіх, поўных горкіх расчараванняў, неспраўджанных надзей і антынародных рэферэндумаў.

Усе добра ведаюць, у якім стане знаходзіцца наша дзяржава, яе эканоміка, адукацыя, культура. Не трэба многа казаць і пра палітыку сённяшняй улады, яе стаўленне да дзяржаўнага суверэнітэта, нацыянальных сімвалаў, нацыянальных каштоўнасцяў і мовы. Варта толькі падкрэсліць, што калі сітуацыю не ўдасца змяніць карэнным чынам, наступных выбараў мы можам ужо не дачакацца. Альбо дачакаемся, толькі абіраць будзем кіраўнікоў іншай краіны.

Таму сёння, выдатна разумеючы ўсю адказнасць за будучыню краіны, усю значнасць сёлетніх падзей, дэмакратычныя сілы Беларусі аб'ядналіся, каб разам перамагчы аўтарытарызм і дыктатуру адзіным законным шляхам - праз удзел у прэзідэнцкіх выбарах.

Але гэтага мала. Сёння неабходна, каб кожны грамадзянін Беларусі адчуў сваю асабістую адказнасць за лёс Бацькаўшчыны, за будучыню той краіны, дзе ён нарадзіўся і жыве.

Мы заклікаем усіх, а асабліва моладзь, адгукнуцца на наш зварот і ўнесці свой уклад у перамогу дэмакратыі і закона, у перамогу Дабра і Справядлівасці. Сёння нам неабходны людзі, якія маглі б прысвяціць крыху свайго вольнага часу на карысць Будучыні, сваёй і сваіх дзяцей.

Канешне, можна сядзець і чакаць героя, які прыйдзе і выратуе Беларусь. Але значна хутчэй зрабіць гэта самім, усім разам, Грамадою. Толькі так можна прымусіць Зло адступіць, сыйсці. Толькі так можна пабудаваць новае жыццё.

Звяртаемся да ўсіх, каму не абыякава, у якой краіне ён заўтра прачнецца: прыйдзіце і дапамажыце! Ваш уклад можа аказацца вырашальным! Гэта - ВАШ ГРАМАДЗЯНСКІ АБАВЯЗАК!

**Наш тэлефон:** (0162) 20-31-21.
**Наш адрас:**
г.Берасце, вул.Карбышава, д.112, кв. 4.

МЫ БУДЗЕМ ЖЫЦЬ У ТАКОЙ КРАІНЕ, ЯКУЮ ПАБУДУЕМ.
ТАК ДАДАЙ НЕКАЛЬКІ СВАІХ ЦАГЛІНАК!

# «СЕМІНАРЫСТЫ» ПРА СЕМІНАРЫ: СТАНОЎЧАЕ І АДМОЎНАЕ

ШТОМЕСЯЦ СЯБРЫ НАШАГА КЛУБА ВЫЯЗДЖАЮЦЬ НА СЕМІНАРЫ Ў РОЗНЫЯ КУТКІ БЕЛАРУСІ І ЗА ЯЕ МЕЖЫ. ЗДАВАЛАСЯ Б, ШТО КАРЫСНАГА МОЖА ЗНАЙСЦІ НА ІХ ЧАЛАВЕК, ЯКІ НАБЫВАЕ АЛЬБО ЎЖО МАЕ УНІВЕРСІТЭЦКУЮ АДУКАЦЫЮ?

Семінары праводзяцца звычайна з адной мэтай: удасканаленне дзейнасці грамадскай арганізацыі. Тэмы бываюць рознымі – ад агульных ("Што такое трэці сектар і яго роля ў грамадстве") да вельмі спецыфічных: ("Арганізацыя працы прэс-службы", "Паблік Рэлэйшнз у грамадскіх арганізацыях", "Стварэнне кааліцый"). Праводзяцца яны даволі цікава, весела, з выкарыстаннем сучасных методык інтэрактыўнага навучання, з рознымі гульнямі ды "батарэйкамі". Сумаваць там няма калі, а тыя асацыяцыі, якія ў вас узнікаюць ад слова "семінар" тут зусім не адпавядаюць рэчаіснасці.

Як правіла ўдзельнікам кампенсуюць усе выдаткі на праезд, харчаванне і пражыванне. Безумоўна, на такіх умовах заўсёды знойдуцца жадаючыя паўдзельнічаць у тым ці іншым семінары.

Узнікае пытанне: ці ёсць вынік у гэтых паездках, ці дасягаюць сваіх мэтаў арганізатары, наколькі карысныімі для клуба "Дзедзіч" і яго сябраў з'яўляюцца набываемыя там веды? Аўтар гэтых радкоў, які таксама ўдзельнічаў не ў адным семінары і мае сваю думку на гэты конт, вырашыў даведацца, як ставяцца да ідэі "семінарнага навучання" іншыя сябры клуба, людзі з вышэйшай альбо амаль вышэйшай адукацыяй. Усім ім было прапанавана адказаць на два пытанні:

**1. Што падабаецца і што не падабаецца табе ў тых семінарах, у якіх ты ўдзельнічаў?**

**2. Ці дапамагаюць табе веды, якія ты там набываеш, у тваім паўсядзённым жыцці, у грамадскай дзейнасці?**



**Руслан Міцін, студэнт 4 курса матэматычнага ф-та.**

1. Па-першае, я набываю новыя веды, вопыт. Па-другое – знаёмлюся з новымі людзьмі, якія таксама дбаюць аб будучыні нашай краіны. Падабаецца ці не падабаецца мне ўдзельнічаць у семінарах? Гледзячы ў якіх. Калі гэта семінары па тэмах, якія мне спатрэбяцца потым у жыцці – так.

Але ёсць адна крытычная заўвага. Часцей за ўсе адбываецца так, што на семінар не прыязджаюць усе падаўшыя заяўку на ўдзел. У выніку гэтага парушаецца праца трэнера, узнікае патрэба рабіць карэктыроўку. Напрыклад, я быў на семінары, які планаваўся як трохдзённы. З-за таго ж, што значная частка людзей не прыехала, тэрмін правядзення быў скарочаны на дзень. Гэта азначае, што частку ведаў, якія я мог бы набыць, я не атрымаў.

2. Канешне. Толькі я не бачу, каб гэта зараз было камусьці вельмі патрэбна, я маю на ўвазе сябраў клуба "Дзедзіч". Павінна быць уласнае жаданне ўдасканаліць сваю дзейнасць, дзейнасць клуба. Я не магу прымусіць іх. Калі ў людзей будзе такое жаданне, я буду нешта канкрэтна рабіць.

Калі браць шырэй, то безумоўна, тыя веды, якія я набываю на семінарах, уплываюць на мой светапогляд, пашыраюць кругагляд. Я вучуся бачыць праблемы не толькі так, як іх асвятляюць, напрыклад у СМІ, а і з іншага пункту гледжання, улічваць розныя меркаванні, думкі. Гэта адна з найбольш важных мэтаў, якія я стаўлю перад сабой.



**Дашына Ярына, 5 курс філалагічнага ф-та.**

1. Семінары можна падзяляць на тыя, якія мне падабаюцца і тыя, якія не падабаюцца. У першую чаргу, на семінарах мяне цікавіць трэнерская праца, метады і прыёмы, якія выкарыстоўваюць трэнеры, тэматыка семінару. Па якім крытэрыям я абіраю семінары у якіх буду ўдзельнічаць? Гэта, па-першае, актуальнасць тэмы для мяне і маёй

## ЁСЦЬ ТАКАЯ ПАРТЫЯ



# Палітыка – РЭАЛЬНАСЦЬ МАГЧЫМАГА

«ДЗЕДЗІЧ» ПРАЦЯГВАЕ ЗНАЁМІЦЬ СВАІХ ЧЫТАЧОЎ З ПАЛІТЫЧНЫМІ ПАРТЫЯМІ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ У НАШЫМ ГОРАДЗЕ. СЁННЯ НАШ СУБЯСЕДНІК - АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ.

Даведка «Дзедзіча»:
**Ляўковіч Анатоль Іосіфавіч.**
**Старшыня Берасцейскай арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная Грамада".** 47 гадоў. Нар. у Гомельскай вобл. у сям'і сялян. Жанаты, мае двух сыноў. Скончыў філасофскае аддзяленне гістфака БДУ. Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі і сацыялогіі БрДУ. У дэмакратычным руху з 1985 г. Стаяў ля вытокаў стварэння БСДП "НГ".

**Вы актыўна займаецеся палітычнай дзейнасцю. Не баіцеся выказваць сваю незадаволенасць палітыкай улад. Ці адчуваеце ціск з боку дзяржаўных органаў, адміністрацыі універсітэта, напрыклад?**

Не, моцных наездаў не было. Я даволі доўга выкладаю ва універсітэце, і шмат хто з маіх былых студэнтаў займае важныя пасады ў горадзе. Магчыма, такія знаёмствы дапамагаюць. Хаця апошнім часам спрабуюць ціснуць, шукаюць нейкі кампрамат.

**Якія абавязкі ўскладзены на старшыню Берасцейскай арганізацыіі БСДП "НГ"?**

Перш за ўсё гэта каардынацыя дзейнасці мясцовых арганізацый па вобласці, развіццё партыйных структур, пашырэнне шэрагаў. Апошнім часам, пасля выбараў у Палату Прадстаўнікоў, калі партыя заняла трошкі іншую тактычную пазіцыю, чым іншыя дэмакратычныя партыі, назіраецца значны ўздым у плане развіцця партыйных структур, прыходзяць новыя людзі. Але галоўнае – гэта ўдзел у выбарах, як у парламент, так і ў мясцовыя саветы.

**Якія задачы стаяць перад Вамі на бліжэйшы перыяд?**

Удзел у прэзідэнцкай кампаніі. Парламенцкія выбары былі для нас рэпетыцыяй прэзідэнцкіх. Зараз аб'ектыўна мы лепш падрыхтаваныя да прэзідэнцкіх выбараў, чым іншыя партыі дэмакратычнай арыентацыі. Мы маем вопыт, адладжаную структуру, падрыхтаваных актывістаў. І гэта – галоўны вынік нашага ўдзелу ў парламенцкіх выбарах. Зараз да нас звяртаюцца прадстаўнікі практычна ўсіх будучых кандыдатаў у прэзідэнты па дапамогу.

**Як "Народная грамада" ставіцца да палітыкі А.Лукашэнкі?**

Вельмі адмоўна. Тут партыя падзяляе пазіцыі іншых дэмакратычных сіл.

**Калі сацыял-дэмакраты атрымаюць магчымасць уплываць на сітуацыю ў краіне, у якім рэчышчы будзе ісці развіццё Беларусі?**

Нам не трэба выдумляць веласіпед. ¨сць досвед сацыял-дэмакратаў заходніх краін, трэба яго выкарыстоўваць. Наш ідэал – гэта нармалёвая еўрапейская краіна, роўная сярод роўных у еўрапейскай супольнасці. Безумоўна, беларуская мова павінна быць адзінай дзяржаўнай, як і нацыянальная сімволіка.

**У пачатку нашай размовы Вы казалі пра іншую тактычную пазіцыю БСДП "НГ" на парламенцкіх выбарах. У чым яе асаблівасці?**

У палітыцы павінны выкарыстоўвацца розныя тактычныя прыёмы, а не толькі лабавая атака. Раней наша партыя рухалася ў фарватары Беларускага Народнага Фронта і не атрымлівала значнай падтрымкі грамадскасці. Падчас апошняй парламенцкай кампаніі мы змянілі тактыку і, я лічу, даволі паспяхова. Усе мы выйшлі з БНФ. БНФ утвараўся як рух супраціву КПСС. І перспектыва ўжо тады была ў падзеле Фронта на некалькі партый, якія зоймуць свае сацыяльныя нішы. Так усё і адбылося. Лібералы арыентуюцца на наймальнікаў, наша партыя – партыя працоўных. Кожная мае свой электарат. І такая партыя, як партыя БНФ патрэбна. Шмат што яна робіць правільна. Хаця, напрыклад, на апошніх выбарах іх тактыка байкоту – гэта лабавая атака. Я лічу такую тактыку памылковай. Палітыка – гэта рэальнасць магчымага. Каб праводзіць байкот, трэба быць упэўненым, што 70-75% выбаршчыкаў падтрымліваюць такую тактыку. Згодна сацыялагічных дадзеных, такога не было.

Зараз усе аналізуюць вынікі парламенцкай кампаніі, таго, як яна праходзіла. А вось вынікі байкоту чамусьці ніхто не аналізуе.

Сутнасць жа нашай тактыкі ў тым, што мы ваюем не супраць рэжыму, а за электарат. Чым больш у нас будзе людзей, тым мацнейшыя мы будзем у змаганні з рэжымам.

**Думаю, Вы пагадзіцеся, што не было сэнсу ісці ў Палату з-за яе, мякка кажучы, малых паўнамоцтваў. Якія мэты Вы ставілі, выстаўляючы сваіх кандыдатаў?**

Так, паўнамоцтваў у гэтага органа няма, і тут мы падзяляем пункт гледжання радыкальнай апазіцыі. Але, калі мы атрымалі пэўныя гарантыі, што як вынікі выбараў, так і сама Палата не будуць прызнаны міжнароднай супольнасцю, тады мы вырашылі ўдзельнічаць у выбарах.

Галоўная мэта ўдзелу – падрыхтоўка да прэзідэнцкай кампаніі. Любая партыя на тое і партыя, каб удзельнічаць ва ўсіх выбарах. Зразумела, што мы спрабуем ціснуць на Лукашэнку, каб змяніць недэмакратычны Выбарчы кодэкс. Але трэба памятаць, што яшчэ ні адзін рэжым сам не арганізаваў свабодныя дэмакратычныя выбары.

Вы ўявіце сябе: ідзе вайна, а супраціўнік ваюе не так, як Вам хацелася б. І Вы тады хаваецеся ў акоп, і кажаце: "Не, ён неправільна ваюе, я з ім ваяваць не буду".

**(заканчэнне на стар. 3)**

## БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ «НАРОДНАЯ ГРАМАДА»



**Председатель ЦК БСДП "НГ" Статкевич Николай Викторович, кандидат технических наук.**
Род. 12 августа 1956г. в д. Лядно Слуцкого р-на в семье учителей. Политикой занялся в 1989 г., когда была создана (подпольно) группа офицеров, которая прогнозировала распад СССР и возможность возникновения гражданской войны. Чтобы избежать втягивания в нее Беларуси, работали над концепцией создания Белорусского Войска. В 1991 г. вышел из КПСС в знак протеста против событий в Вильнюсе. В 1996 г. избран председателем ЦК БСДП «НГ». Женат, имеет две дочки - 17 и 14 лет.

**ЗА** европейское правовое государство
**ЗА** цивилизованную рыночную экономику
**ЗА** надёжную социальную защиту каждого человека
**ЗА** политическую стабильность и общественное согласие
**ЗА** верховенство законов и приоритет прав человека
**ПРОТИВ** неограниченной власти чиновников
**ПРОТИВ** управления экономикой бюрократов
**ПРОТИВ** бесправия простого человека
**ПРОТИВ** подавления инакомыслия
**ПРОТИВ** подмены власти закона властью силы

# Пакуль мы адзіны – НАС НЕ ПЕРАМОГУЦЬ

**24 СТУДЗЕНЯ У ГОРАДНІ ПАЧАЎСЯ СЕМІНАР “АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КАМАНДЗЕ”, АДНОЙ З УДЗЕЛЬНІЦ ЯКОГА БЫЛА І Я.**

Нажаль, толькі ў першы дзень. Бо ўначы 25 студзеня я трапіла ў Гарадзенскую абласную бальніцу з дыягназам “фурункулез нижней губы простудного характера”. Хірург быў настроены сур’езна: “Аперацыя. Потым пабудзеш тут у нас дзён пяць. Больш трымаць не маем права, бо ты іншагародняя.” Медыцынскія падрабязнасці апускаю. Але ўявіць сябе мой псіхічны стан не цяжка: семінар скончыцца, а я застануся адна – без грошаў (іх ў мяне паспелі выцягнуць недзе ў транспарце) і цалкам адна ў незнаемым горадзе. Але, як высветлілася, я была не адна. І за гэта вялікі дзякуй трэнерам Альянса Каўнтэрпарт Руднікам Святлане і Вітаўту. Яны мяне літаральна выратавалі: закармілі рознымі прысмакамі (каб не аслабела ад шпітальных страў), прынеслі “жаночых часопісаў” (гэта, напэўна, была ідэя Святланы: думаю, яна добра разумела, як я сябе адчуваю з павязкай, якая прыкрывае амаль цалкам ніжнюю палову твара), далі грошаў на дарогу дахаты. Але галоўнае – я адчувала, што пра мяне ёсць каму паклапаціцца.

Вы скажаце: што цікавага ў гэтай няўдалай паездцы? Гэта асобны выпадак. Канешне, добра, што трапіліся такія надзейныя людзі, але гэта нічога не даказвае. Бо колькі людзей у падобных сітуацыях не знаходзяць дапамогі. Дазвольце тады расказаць вам другую гісторыю.

Магчыма, вы ведаеце, што памяшканне рэсурснага цэнтра “Вежа” абакралі. Вынеслі кампутары і некаторыя паперы. Гісторыя гэта трапіла ў крымінальную хроніку ўсіх мясцовых газет. Але што адбылося потым, вядома куды меншаму колу людзей. “Вежы” дапамаглі хто чым здольны: кампутары, прынтары, факс, сканер, мадэм і ўжо праз тыдзень «Вежа» прыступіла да сваёй паўсядзённай працы. А гэта ўжо не асобны выпадак, а хутчэй, заканамернасць, якая ілюструе адносіны ў трэцім сектары. **Розныя грамадскія арганізацыі могуць мець розныя мэты і накірункі дзейнасці, але калі патрэбна – аб’ядноўваюцца, каб дапамагчы таму, хто трапіў у бяду.**

**Данута Раманоўская**

# ПАЛІТЫКА – РЭАЛЬНАСЦЬ МАГЧЫМАГА

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 2)**

Канешне, лепей сядзець на канапе, папіваючы гарбату, і гаварыць: “Ах, які рэжым! Ах, якія недэмакратычныя выбары, недэмакратычны закон!”.

ТРЭБА ЗМАГАЦЦА Ў ЛЮБЫХ УМОВАХ! І ставіць канкрэтныя мэты. У нас была задача: “Выбіць хаця б адзін акоп”. Яна грунтуецца на вопыце сусветнай сацыял-дэмакратыі. У замежных краінах таксама праходзілі недэмакратычныя выбары, і ў іх была мэта – хаця б аднаго кандыдата правесці ў парламент. Заваяваць адзін плацдарм.

**Ці будзе БСДП “НГ” вылучаць свайго кандыдата на прэзідэнцкія выбары?**

Не. На гэтых выбарах мы павінны вылучыць у якасці кандыдата кампрамісную фігуру, якая задаволіла б і Захад і Крэмль. ¨н павінен быць прадстаўніком шырокай сацыяльнай апазіцыі, у якую ўвайшлі б і апазіцыйныя партыі, і простыя людзі, якіх не задавальняе сённяшняе жыццё. Калі б мы здолелі зарэгістраваць такую кампрамісную фігуру і салідарна правесці кампанію, то гэта было б рэальнай пагрозай рэжыму.

**Якую праграму павінен мець кандыдат, каб атрымаць падтрымку “Народнай Грамады”?**

Па-першае, падпісаць платформу, якая выпрацавана Нацыянальным Выканаўчым камітэтам на чале з Мечыславам Грыбам.

Па-другое, неабходна правесці ўзгадненне механізма вылучэння адзінага кандыдата. Такі механізм патрэбен на той выпадак, калі рэгістрацыйнае сіта пройдуць некалькі кандыдатаў.

Калі дзве гэтыя рэчы кандыдат згадзіцца выканаць, на стадыі збора подпісаў ён атрымае нашую падтрымку.

**Як Вы лічыце, ці ўдасца аб’яднанай апазіцыі ўсё ж такі пайсці па югаслаўскаму варыянту і на пэўным этапе пакінуць толькі аднаго кандыдата?**

Цяжка сказаць. Мяне вельмі насцярожвае пазіцыя радыкальнай апазіцыі, у прыватнасці спадара Лябедзькі (старшыня АГП – Б.Д.). АГП задумвалася як партыя прадпрымальнікаў, куды павінна была прыйсці і наменклатура. Вы памятаеце, як у свой час наменклатура здала Кебіча, і, калі б мы зараз мелі падтрымку хаця б яе часткі, лёс Лукашэнкі быў бы вырашаны вельмі хутка.

Спадзяюся, што нам усім хопіць розуму, у першую чаргу радыкальнай апазіцыі, аб’яднаць свае намаганні і пакінуць адну кампрамісную фігуру.

**Хто, на Вашу думку, мог бы стаць кампраміснай фігурай?**

Магчыма, Казлоўскі, былы міністр абароны, альбо Ганчарык – старшыня Федэрацыі прафсаюзаў беларускай.

У прынцыпе, не важна, Іваноў ці Пятроў. Галоўнае, каб ён прыняў тыя патрабаванні, пра якія я гаварыў. Каб ён быў патрыётам Беларусі, здольным правесці дэмакратычныя пераўтварэнні ў краіне.

**У дэмакратычных краінах партыі, нават якія знаходзяцца ў апазіцыі, даволі моцна ўздзейнічаюць на ўлады з мэтай вырашэння тых ці іншых праблем. Ці ёсць у берасцейскіх сацыял-дэмакратаў магчымасць уплываць на вырашэнне мясцовых праблем?**

У часы Кебіча ўлады наладжвалі з намі сустрэчы, абмяркоўвалі шляхі вырашэння розных праблем. Цяпер гэтага няма, гэта па-просту немагчыма. Хаця зараз мы правялі свайго кандыдата ў Гарсавет – Наталлю Галаніну, – будзем спрабаваць ціснуць праз яе.

**Уявім сябе, што я праніксся ідэямі сацыял-дэмакратыі, я хачу азнаёміцца з праграмай БСДП “НГ”, стаць сябрам партыі. Куды я магу звярнуцца?**

Зараз у нас з’явілася памяшканне, побач з рэдакцыяй “Брэсцкага кур’ера”, і пасля рамонту можна будзе прыходзіць туды. А пакуль можна тэлефанаваць альбо мне дахаты (23-98-88), альбо Георгію Руцкаму, старшыне гарадской арганізацыі БСДП “НГ” (23-54-89).

**У канцы траўня мы плануем правесці сустрэчу лідэраў берасцейскіх аддзяленняў партый з берасцейскай моладдзю. Ці згодны Вы прыняць у ёй удзел?**

З задавальненнем.

**Што б Вы пажадалі берасцейцам?**

Правільнага выбару. Гэтая прэзідэнцкая кампанія пасутнасці будзе вырашаць лёс Беларусі.

У новае стагоддзе – з новым прэзідэнтам! Гэта той лозунг, з якім мы йшлі на парламенцкія выбары, і той лозунг, з якім я звяртаюся да берасцейцаў.

**Шчыра дзякую Вам за інтэрв’ю, якое, я ўпэўнены, выклікае вялікую цікавасць у нашых чытачоў. Хочацца спадзявацца, што Вашы намаганні выратаваць Беларусь знойдуць падтрымку новага пакалення берасцейцаў.**

**Гутарыў Б.Дэпеша**

# «СЕМІНАРЫСТЫ» ПРА СЕМІНАРЫ...

арганізацыі. Па-другое, асабістае знаёмства з трэнерам (гэта дазваляе загадзя ведаць наколькі карысным будзе семінар). Па-трэцяе, цікава пазнаёміцца з новымі людзьмі, новым горадам.

2. Веды, набытыя на семінарах, дапамагаюць мне як у настаўніцкай працы, так і ў сяброўскай кампаніі за бутэлькай піва. Я лічу, што гэтыя семінары патрэбны, бо на іх можна абмяняцца вопытам, пачэрпнуць шмат важнай інфармацыі. Аднак, я лічу, што трэба рабіць нейкі адбор удзельнікаў, каб выпадковыя людзі не траплялі на семінар.

**Лізевіч Сяргей, 4 курс фізічнага ф-та.**



1. Я не маю яшчэ вялікага досведу ў паездках на семінары, але лічу, што яны патрэбны, бо дапамагаюць рознабаковаму развіццю чалавека. Таксама гэта магчымасць добра і з карысцю адпачыць ад паўсядзённых спраў. На семінары можна на людзей паглядзець і сябе паказаць.

2. З большага – так.

**Красько Уладзімір, 4 курс фізічнага ф-та.**



1. Семінары – гэта і цікавая новая інфармацыя, якая неабходна ў працы нашага клуба, і проста новыя сустрэчы, знаёмства. Удзельнічаць у іх мне не проста падабаецца, а вельмі падабаецца, і я з вялікім захапленнем чакаю магчымасці трапіць на семінар з цікавай карыснай тэматыкай.

2. Семінары даюць магчымасць атрымаць навыкі публічных выступаў, проста зносін з незнаёмымі людзьмі.

**Шастак Дзмітрый, 4 курс фізічнага ф-та.**



1. Для мяне семінары – гэта знаёмства з новымі мясцінамі, гарадамі, людзьмі. Там весела, часам трапляецца карысная інфармацыя. Ды і ўвогуле нешта новае – гэта заўсёды цікава ў любым выпадку.

2. Часткова веды, набытыя там дапамагаюць у арганізацыі маёй грамадскай дзейнасці, напрыклад, у арганізацыі працы круглага стала эколагаў, сябрам якога з’яўляецца наш клуб. А праз некалькі месяцаў (я маю на ўвазе прэзідэнцкія выбары) ўсе веды, што я маю магчымасць атрымоўваць, вельмі спатрэбяцца.

**Алесь Вярэніч, 5 курс філалагічнага ф-та.**

1. Галоўнае ў кожным семінары, я лічу, — прафесійны ўзровень трэнераў, з якога, зразумела, зыходзіць і добра падабраная методыка, якасная інфармацыя, і агульная атмасфера ў групе. Яшчэ адна заўвага – трэба эканомна выкарыстоўваць свой час. Калі ты ўжо вырашыў прыняць удзел у семінары – адпрацуй так, як мае быць, на 100%.

2 Калі б вы запыталіся ў Біла Гейца, што самае каштоўнае ў свеце, ён, напэўна, адказаў бы вам : ”Інфармацыя”. Але “ інфармацыя” яшчэ не значыць “карысныя веды”. Прымаючы рашэнне аб удзеле ў тым ці іншым семінары, трэба думаць, што табе і тваёй арганізацыі неабходна менавіта зараз, што актуальна і ў чым ты не досыць дасведчаны.

Як бачна, абсалютна ўсе, каго мне давялося апытаць, шчыра вітаюць ідэю правядзення семінараў, інтэрактыўныя методыкі ды іншыя сучасныя напрацоўкі, якія выкарыстоўваюць трэнеры (трэнер – гэта як бы настаўнік, але не зусім і не толькі) ў сваёй працы. Аднак рэалізаваць набытыя там веды змаглі далёка не ўсе. Магчыма ў клубе не створаны ўмовы для выкарыстання набытых ведаў, магчыма проста не хапае ініцыятывы і жадання? Тыя ж крытычныя заўвагі, якія былі выказаны “семінарыстамі”, мяркую, дапамогуць арганізатарам семінараў у павышэнні эфектыўнасці і выніковасці іх правядзення.

Хочацца таксама спадзявацца, што маладыя выкладчыкі нашага універсітэта знойдуць прымяненне тым элементам інтэрактыўнага навучання, якія яны мелі магчымасць пабачыць на семінарах, у сваёй прафесійнай дзейнасці.

**Б.Дэпеша**

**КАЗКІ ЖЫЦЦЯ**

# НАВУКА ВЫЖЫВАННЯ

*Мы жывем у жудасным брудзе,*
*Дзе ствараюць з нас пацукоў.*
*Каб потым, выйшаўшы ў людзі,*
*Рабілі з дзяцей мы лахоў.*

ЗДАРЫЛАСЯ ГЭТАЯ ГІСТОРЫЯ Ў СЛАЎНЫМ ПАВЯТОВЫМ ГАРАДКУ "Б" НА АДНОЙ З ЦЭНТРАЛЬНЫХ ВУЛІЦ (А МЕНАВІТА "Л"), У БУДЫНКУ СА СТРОГАЙ НАЗВАЙ "І №1", КУДЫ ЗБІРАЛІСЯ ПРЫЕХАЦЬ РЭВІЗОРЫ.

Але давайце па парадку.

"І №1" - будынак, дзе жылі семінарысты. І не проста семінарысты, а будучыя настаўнікі. Жылося ім цяжка. Людзі без права голасу, без права выбару... Вядома ж, што настаўнік—прафесія не з лёгкіх. Вось і вырашылі нашых навучэнцаў "трэніраваць". Пачынаць трэніроўку патрэбна там, дзе жывеш. Узлажылі гэтую «пахвальную» справу на адміністрацыю «І№1», што складалася з трох чалавек: надзірацеляў Сарокінай і Прыдзіркінай, а таксама Металашукальніка. Не вельмі падабалася ім гэтая справа, але што рабіць, калі ціснуць «зверху». І вырашылі яны стварыць для семінарыстаў невыносныя ўмовы, няхай, маўляў, не расслабляюцца. Няхай загартоўваюцца на будучае жыццё.

Юціліся нашыя семінарысты ў невялічкіх пакойчыках на 4 чалавекі. Тыя, хто меў заслугі - па 3, ну а тыя, хто жылі ўдваіх, плацілі грошы «нужным людям». Хочаш жыць - умей круціцца. І сапрауды, каму зараз легка?

Пакоі быццам і нічога, каб не пачвары-прусакі, якіх травілі чамусьці толькі на кухнях, і таму яны разбягаліся па пакоях, дзе і асядалі, адчуваючы сябе сапраўднымі гаспадарамі. На кухні выбіраліся толькі ў галодныя дні. А ўмовы якія былі ідэальныя для прусачкоў! Брудненькія, з непрыемным пахам кухні проста манілі пачвар да сябе.

Вы скажаце: «Жах!». Не, гэта проста трэніроўка. Невядома, у якія глухія куточкі занясе нашых семінарыстаў размеркаванне. А можа, ім прыйдзецца гатаваць ежу ў зусім невыносных умовах.

Але пакінем пакуль кухні і пяройдзем да ўмывальнікаўпрацякальнікаў. Чаму працякальнікі? О, гэта элементарна. Будынак быў стары - вось трубы і знасіліся. Іх паела славутая іржа - ўтварыліся дзіркі, і палілася вадзіца ракою. Калі яна была, канешне.

Што значыць была?

Перыядычна ваду адключалі, часцей, паэтапна: спачатку гарачую, а потым – халодную. Тады ўмывальнікі-працякальнікі заміралі.

А ўборныя... Уборныя – гэта цэлая легенда. Велізарныя кучы смецця і дзярма. Калі вада была, часценька прарывала каналізацыйную трубу, і ўтвараўся «вадаспад-...аўнапад». Калі вады не было - ўборныя зачынялі. Функцыяніруючымі заставаліся звычайна два кабінеты – адзін для хлопчыкаў, другі - для дзяўчынак. Здзек!!! Але нашыя семінарысты не апускалі нос і хадзілі ў пакой пад назвай «расслабляльна-катавальны», дзе можна было памыцца. Толькі вельмі хуценька. Бо сцены ў «расслабляльна-катавальным» пакоі былі пакрыты іржой і яе сяброўкамі: плесняй і чорным брудам. Для тых, хто цікавіцца біялогіяй, быў дадатак: часценька можна было назіраць чарвячкоў у пакоі. А што? Карыснае сумяшчалі з прыемным. І мыешся, і вывучаеш падвіды беспазваночных.

Адміністрацыя глядзела на ўсе скрозь пальцы, таму і прыбіральшчыцам усё гэта было «да фені». Прыбіральшчыцы грозна, як БТРы, ездзілі па калідорах, упершы швабру ў жывот і мылі спачатку ўборную, а потым гэтаю ж вадою і калідоры. Праводзілася так званая «газавая атака».

Быў яшчэ слесар, які падбіраў усё, што дрэнна ляжала, а таксама Прысоскін – дзед, які быццам прачышчаў трубы, але неяк недарэчна: проста разганяў ваду па калідорах, на якой пакоўзваліся семінарысты, і зазіраў часценька ў жаночую «расслабляльна-катавальную» душавую.

І вось павінны былі прыехаць рэвізоры. Ганцы паведамілі аб гэтым загаддзя. Рэвізораў чакалі і семінарысты, і адміністрацыя. Першыя - з надзеяй, другія – з незадавальненнем. І пачаўся вялікі «шухер». На вокнах з'явіліся шторкі і кветкі. Уборныя прыбралі чысценька, як ніколі. Кухні і калідоры ўзвалілі на хрупкія плечы семінарыстаў, а на «расслабляльна-катавальную» вырашылі ў той дзень павесіць велізарны замок, а ключ на час «згубіць».

І прыехалі рэвізоры, і паглядзелі на тое, што ім паказалі. І быў банкет. І напісалі рэвізоры, што «І№1» - лепшы жылы будынак сярод навучальных устаноў. І павесіла адміністрацыя гэты «пахвальны ліст» у будынку «І№1». І зніклі кветкі з вокнаў, і знялі замок, і зноў стала прывычна брудна. А семінарысты ўздыхнулі і зноў пачалі праходзіць трэніроўкі «на выжыванне».

**Вольга Дастанка**

**Ад рэдакцыі:** Мы не схільны лічыць, што справы ў будынку пад назвай «І№1» на самой справе выглядаюць так жудасна, як апісала Вольга Дастанка. Хаця дыму без полымя... Прапануем адміністрацыі будынку выказаць сваю думку наконт сітуацыі ў Вашай епархіі. Таксама хацелася б пачуць, як жа трываюць жыхары тых «будынкаў», якія не атрымалі «пахвальнага ліста» ад рэвізораў.

# КАЗКІ, якія чытаюць дзеці

Сама я не вельмі свабодна валодаю беларускай мовай. Але чытаць па-беларуску люблю з дзяцінства, з тых яшчэ часоў, калі мне ў рукі трапіла выдатна ілюстраваная кніга «Маўглі» ў перакладзе з ангельскай мовы. Дзякуючы ёй, я пасля ўжо не ўспрымала рускамоўнага Маўглі, нават у мульціках.

І вось, зайшоўшы аднойчы ў кніжную краму, убачыла як бы прывітанне з дзяцінства: добра выданую падборку беларускіх чарадзейных казак «Прыстань Ваўкалакаў». Прынесла свой набытак да дому, і вырашыла цалкам «здзяцініцца» - села чытаць казкі. Але ўжо на трыццаць сёмай старонцы заўважыла першы русізм: выраз «затридевять земель, в тридесятом царстве», наколькі я ведаю, не мае адпаведніка ў беларускай мове. На 60-ай старонцы на вочы трапіў «Кашчэй Бессмяротны». Але ж памятаю, яшчэ са школьных часоў, як усіх худых у нас называлі Чахлік Неўміручы.

Потым рабілася ўсё цікавей і цікавей: на адной старонцы галоўны герой корміць чароўную птушку «печанню» (а не «не пячонкай») і «гавядзінай» (не «ялавічкай»). Прыкладаў такіх русізмаў рабілася ўсе болей, а потым прыглядзелася і да назваў саміх казак: "Удовін сын", «Ілюша, Іванаў сын» (казка пра Іллю Мурамца), «Іван - дурань», «Снягурачка». Назвы і сюжэты - не тое, каб вельмі арыгінальныя і незнаёмыя; падабенства з рускімі казкамі прасочваецца збыт яўна. Нават імёны галоўных герояў - не тыпова беларускія (ніводнага не звалі Алесем, Мікалаем, Рыгорам...). Канешне рускія і беларускія казкі могуць быць падобнымі, але часам ствралася ўражанне, што недобрасумленны ўкладальнік скарыстаўся не беларускім фальклорам, а хутчэй перакладам рускіх казак на беларускую мову.

Хацелася б запытаць спадара Гурскага А.І. (укладальнік «Прыстані Ваўкалакаў») - а сам ён чытае сваім дзецям гэтыя беларускія казкі? І як – падабаецца ім?

Мне не спадабалася. А сваім дзецям я такую кніжку магу прапанаваць толькі ў якасці практыкавання «знайдзі 10 памылак» ці "як нельга пісаць пабеларуску".

**P.S.** А калі жадаеце сапраўдных казак, прапаную зборнік «Вясна ўвосень» Ул.Караткевіча.

**Данута Раманоўская**

# ВЫБАРЫ 2001
# ВАЧЫМА НЕЗАЛЕЖНАГА НАЗІРАЛЬНІКА

## Паўторныя выбары ў Берасце адбыліся. Ура?

ДЛЯ НЕЗАЛЕЖНЫХ НАЗІРАЛЬНІКАЎ, ШЭРАГІ ЯКІХ З МІНУЛЫХ ВЫБАРАЎ ПАШЫРЫЛІСЯ, СВЯТКАВАЦЬ, АДНАК, ЯШЧЭ НЕ ЧАС: ПАРУШЭННЯЎ БЫЛО ШМАТ.

Па-першае, у сувязі з агульнай пасіўнасцю берасцейцаў, гарадскія ўлады далі ўказанне адміністрацыі розных гарадскіх устаноў забяспечыць масавую яўку сваіх падначаленных на выбарчыя ўчасткі. Пры гэтым - датэрмінова. У адваротным выпадку - пазбаўленне прэміі, альбо высяленне з інтэрнату. Здаецца, нікаму з дырэктараў прадпрыемстваў і ўстаноў не было часу прачытаць выбарчы кодэкс, а менавіта артыкул 5, частку 1 - «... выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць». Таму можна смела сказаць, што вялікая колькасць берасцейцаў прыйшла на выбары не па сваёй волі (для канкрэтыкі можна прывесці ў якасці прыклада працоўных будтрэсту N8 і завода ЖБК).

Па-другое, усе ж з мэтай забеспячэння масавасці, самі выбарчыя камісіі аўтаматычна ўключалі ў спісы для галасавання па месцу знаходжання ўсіх выбаршчыкаў, старэйшых за 60 год, нават не дачакаўшыся просьбаў з боку апошніх.

Па-трэцяе, і самі выбаршчыкі маюць вельмі прыблізнае ўяўленне аб тайным галасаванні, нярэдка назіраліся сцэны, калі ў адну кабіну для галасавання заходзілі цэлымі сем'ямі, па двое-трое чалавек.

Пра такія парушэнні, як галасаванне без пашпарту або па якому-небудзь пасведчанню, накшталт пропуску са свайго прадпрыемства, або студэнцкага білета (якія, дарэчы, не з'яўляюцца пасведчаннем асобы), можна і не гаварыць - гэта бачылі назіральнікі амаль на ўсіх выбарчых участках. Пры гэтым старшыні выбарчых камісій тлумачылі гэта тым, што камісія амаль усіх выбаршчыкаў ведае асабіста, бо гэта - сябры, знаёмыя, суседзі.

Аднак здаецца малаверагодным, што можна ў твар ведаць паўтары ці дзве тысячы чалавек (а гэта і есць прыблізная колькасць выбаршчыкаў на ўчастку).

Аднак самыя сур'езныя парушэнні назіраліся на этапе падліку галасоў. Як вядома, бюлетэні з кожнай урны падлічваюцца асобна. Але гэта - ў тэорыі. На практыцы змесціва ўсіх урнаў нярэдка высыпалі на стол, а потым ужо лічылі галасы, паданыя за кожнага кандыдата. На ўсе пытанні старшыні камісіі звычайна адказвалі: «А якая розніца?»

І гэта наводзіць на сумныя роздумы: да таго часу, пакуль надзеленыя ўладай людзі на заўвагу аб парушэнні існуючага заканадаўства адказваюць «А якая розніца?», Беларусь наўрад ці стане дэмакратычнай краінай.

**Поспехаў вам на выбарах прэзідэнта!**

**Данута Раманоўская.**

# ОБРАЩЕНИЕ
## Консультативного совета оппозиционных политических партий
# ОБ ИТОГАХ ВЫБОРОВ В БЕЛАРУСИ

1 апреля 2001 года завершились выборы в нынешний белорусский парламент. Они со всей очевидностью показали, что действующая власть не намерена прислушиваться к призывам мировой общественности и организовывать избирательный процесс в соответствии с требованиями демократических стандартов.

Прошедшие выборы повсеместно были отмечены грубейшими нарушениями избирательного законодательства Республики Беларусь: значительных масштабов достигла практика искусственного исключения из избирательного процесса неугодных власти кандидатов в депутаты; массовый характер имело принудительное досрочное голосование; в ряде избирательных округов число досрочно проголосовавших превысило 50% от общего числа избирателей; для признания выборов состоявшимися власти проделывали манипуляции со списками избирателей. По отдельным избирательным участкам сокращение числа избирателей достигло 50%.

Как никогда прежде, исполнительная власть использовала административный ресурс. За каждым участком были закреплены ответственные работники органов исполнительной власти. На многих предприятиях, в учреждениях и учебных заведениях издавались официальные распоряжения, обязующие работников и учащихся досрочно голосовать, в связи с чем они освобождались от работы и учебы. Для этого выделялся автотранспорт, члены избирательных комиссий доставляли избирательные урны и бюллетени к месту работы и учебы. Руководители предприятий, учреждений и организаций составляли графики голосования работников с указанием даты и времени досрочного голосования. Голосовать заставляли под угрозой лишения премий, выселения из общежития, отключения горячей воды.

Массово и бесконтрольно проходило голосование по месту нахождения избирателей (на дому). С целью повышения процента явки проголосовавших члены избирательных комиссий без предварительных заявлений избирателей, по собственной инициативе, обходили многоквартирные дома, предлагая жильцам проголосовать. При этом они имели неучтенные избирательные бюллетени. Наблюдателей не допускали следить за ходом досрочного голосования, не предоставляли им сведения о количестве избирателей в списках для голосования, не выдавали копии протоколов об итогах голосования. Окружные избирательные комиссии нередко переделывали протоколы, поступившие к ним из участковых и избирательных комиссий

Многочисленные нарушения избирательного законодательства, зафиксированные наблюдателями, дают все основания утверждать: выборы в нынешний белорусский парламент были несвободными, недемократичными и несправедливыми, а результаты их фальсифицированы.

Обращение кандидатов в депутаты, их доверенных лиц и наблюдателей в прокуратуры и суды по фактам нарушения избирательного законодательства остались без удовлетворения.

КС ОПП считает, что действующая власть провела генеральную репетицию и опробовала выборные технологии, которые будут широко использоваться при проведении президентских выборов.

Важным инструментом для вмешательства властей в избирательный процесс при проведении президентских выборов может стать Декрет № 8 от 12 марта 2001года «О некоторых мерах по совершенствованию порядка получения и использования иностранной безвозмездной помощи», который повлечёт за собой негативные последствия для международного сотрудничества Беларуси и приведёт к дальнейшей её изоляции.

КС ОПП озабочен политической ситуацией в Республике Беларусь в преддверии президентских выборов и обращается к Вам с предложением поддержать наши требования к властям:

- прекратить преследования политических оппонентов, в том числе потенциальных кандидатов в президенты;
- обеспечить доступ к государственным СМИ, в первую очередь к телевидению и радиовещанию;
- обеспечить включение представителей оппозиции в избирательные комиссии;
- не препятствовать регистрации кандидатов в президенты, собравших необходимое количество подписей;
- обеспечить надлежащий контроль над изготовлением, хранением и использованием избирательных бюллетеней;
- не допускать принуждения к досрочному голосованию и голосованию на дому;
- устранить необоснованные препятствия для свободного наблюдения за выборами.

Принято на заседании КС ОПП 5 апреля 2001 г.

**(Печатается с сокращениями)**

**Материал предоставил М.И.Пастухов, руководитель Центра правовой защиты СМИ**

**От редакции:**

Кому, как ни нам, в Бресте, лучше знать о том, какой силы достиг нажим власти во время повторных выборов в Палату Представителей. Сообщениями о нарушениях избирательного процесса полна демократическая пресса, набили оскомину слова о невиданном доселе использовании административного ресурса.

Поистине, эти выборы войдут в историю, как образец разнузданности и безнаказанной наглости со стороны власть придержащих. Именно поэтому мы и опубликовали Обращение Консультативного совета, подписанное всеми партиями демократической ориентации, кроме ПКБ, под рубрикой «Гісторыя».

От себя же добавим к этому лишь один штришок, о котором нам стало известно буквально накануне выхода номера.

Многие берестейцы могли видеть праздничный выпуск газеты «Вечерний Брест экспресс», посвящённый Международному женскому дню 8 марта, в котором в мягкой ненавязчивой форме были представлены прямые агитационные материалы о женщинах кандидатах в депутаты «от власти».

**Как нам стало известно, заказчиком этого «агитационного листка» выступил брестский горисполком, который и оплатил печать выпуска (стоимость заказа превышает $1000).**

Таким вот образом на деньги налогоплательщиков власть «выбирает» угодных себе кандидатов. Остаётся только порадоваться, что затраченные ими ресурсы не пропали даром.

# МЫ ЗНОЎ РАЗАМ

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Увечары на конкурсе выпечкі мы аб'ядаліся кулінарнымі вырабамі, якія прыгатавалі нашы дзяўчынкі.

**3.** За гэты час мы правялі тры семінары ("Праца ў камандзе", "Абарона інтарэсаў грамадскай арганізацыі", "Падрыхтоўка валанцёраў..."), першыя два з якіх – апафеоз інтэрактыўнасці, а трэці – проста знаёмства з карыснай інфармацыяй пра валанцёрскую працу. А колькі семінараў наведалі і не пералічыць.


Семінар «Праца ў камандзе»

**4.** Мы дапамаглі рэабілітацыйнаму цэнтру дзяцей-інвалідаў у добраўпарадкаванні тэрыторыі (гл. падрабязней стар. 8).


Ралевая гульня на семінары

5. Распачата сацыялагічнае даследаванне "Маніторынг грамадскай думкі берасцейцаў". Першыя вынікі глядзіце ў наступным нумары бюлетэня.

6. Працягваюцца конкурсы ў рамках праекта "Беларусь мая непаўторная". Мы атрымалі шмат цудоўных прац не толькі з гарадоў Берасцейшчыны, але і з іншых рэгіёнаў. Умовы ўдзелу – с. 7.

Яшчэ больш цікавых мерапрыемстваў намі запланавана на бліжэйшы час. Таксама абяцаем больш не спазняцца з выхадам чарговых нумароў.

Спадзяемся, што Вы таксама рады нашаму вяртанню на рынак незалежнай прэсы і знойдзеце ў «Дзедзічы» яшчэ больш карыснай актуальнай інфармацыі.

Яшчэ больш спадзяемся, што, чытаючы пра нашы поспехі, вам захочацца самім паўдзельнічаць у працы нашага клуба.

**Прэс-служба ДАК Дзедзіч**

# Барановичи - за национальное возрождение

## Комплексный анализ результатов анкетирования по выявлению отношения населения к белорусской культуре.

*В рамках работы над программой «Экономического возрождения Беларуси», студенческим научным обществом «Паллада» было проведено широкомасштабное анкетирование жителей города Барановичи на предмет отношения опрашиваемых к нашей национальной культуре.*

В результате было опрошено более 600 респондентов. Опрос охватил представителей всех возрастных категорий, людей с различным уровнем образования и доходов (рисунки 1 и 2).



Рис 1. Структура опрашиваемых по уровню образования.



Рис.2 Структура опрашиваемых по уровню дохода.

Показательно, что 23,9% получает доход ниже 25 долл. в месяц т.е. ниже прожиточного минимума. А 57,6% жителей получают доход до 100 долл. 17,1% от 100 до 1000 долл. и только 1,3% более 1000 долл. Вместе с тем, доход от 1 до 10 тыс. долл. в развитых странах является признаком среднего, т.е. самого многочисленного слоя населения.

На вопрос, «Считаете ли вы себя Белорусом» респонденты ответили следующим образом: да, считаю – 64,1%; нет, не считаю – 19,3%; не задумывались над этим – 16,6%. Как видим подавляющая часть опрашиваемых считает себя Белорусами и соответственно Белорусскую культуру родной.

Более того, согласно последней переписи населения, в нашем городе 78,3% белорусов по национальности и 72,3% населения называет белорусский язык родным.

Однако говорит на белорусском языке в повседневной жизни, согласно нашему опросу, только 9% населения. Ещё 38,5% жителей думают, что вполне смогли бы разговаривать на белорусском языке. 41% думают, что не смогут говорить на нем, а 11,5% признаются, что вообще не знают белорусского языка.

Если немного вдуматься в эти цифры, то оказывается не все так плохо, как кажется и те, кто говорят, что Белорусы сами не знают своего языка - ошибаются. Половина наших соотечественников вполне может разговаривать на родном языке, а остальных научим, тем более, что многие сами хотят учиться на белорусском языке.



Рис.4. Распределение ответов на вопрос: «Отдали бы Вы своих детей в белорускоязычную школу»

Как видно на рисунке 4 только 15% населения категорически не желает, чтобы их дети учились на белорусском языке. 25,6% сомневаются, 33,6% думают, что в этом нет ничего плохого, а 16,1% считают обучение на родном языке обязательным для своих детей. 9,5% не смогли ответить на вопрос.

Анализируя структуру ответов на вопрос: «Отдали бы вы своих детей учиться в белорускоязычную школу», в зависимости от уровня образования опрашиваемых была выявлена следующая тенденция.

Таблица 2. Структура ответов на вопрос: «Отдали бы вы своих детей учиться в белорускоязычную школу», в зависимости от уровня образования опрашиваемых.

| Уровень образования | Варианты ответа | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Нет, ни за что | Скорее нет | Да, возможно | Да, обязательно | Затрудн. ответить |
| **Базовое (9кл)** | **19** | **24** | **31** | **12** | **14** |
| **Среднее (11 кл)** | **18** | **32** | **31** | **12** | **6** |
| **Средне-спец.** | **16** | **23** | **34** | **14** | **13** |
| **Высшее** | **10** | **21** | **38** | **24** | **8** |
| **Ученая степень** | **11** | **22** | **33** | **33** | **0** |
| ВСЕГО | 15 | 26 | 34 | 16 | 9 |

Как хорошо видно из таблицы, по мере повышения уровня образования доля категорических противников белорусского языка в школах существенно снижается (с 19% у имеющих базовое образование, до 10% у имеющих высшее образование). Количество активных сторонников напротив возрастает почти в три раза (с 12% у имеющих базовое образование, до 33% у имеющих ученую степень). Структура средних ответов (скорее нет, или возможно да) также немного склоняется в пользу белорусскоязычных школ.

На основании этого можно сделать вывод, что более образованные люди быстрее понимают, что без родного языка нет культуры, а значит нация обречена на постепенное угасание. И, так или иначе, а свой родной язык возрождать придётся.

А в том, что мы самостоятельная нация, нет никакого сомнения. Ведь, отвечая на вопрос: «Считаете ли вы, что белорусская нация должна развиваться самостоятельно» положительно ответили 67,4% (более чем 2/3 опрошенных), а отрицательно только 12,1%. Правда велика доля тех, кто не задумывался над этим – 20,5%. Если рассмотреть структуру ответов на этот вопрос в зависимости от возраста респондентов, то получим следующую картину:

Рис 5. Распределение ответов на вопрос:" Считаете ли вы, что белорусская нация должна развиваться как самостоятельная"




Таблица 3. Структура ответов на вопрос «Считаете ли вы, что белорусская нация должна развиваться самостоятельно» в зависимости от возраста респондентов.

| Возраст опрашиваемых | Варианты ответа | | |
|---|---|---|---|
| | Да | Нет | Не задумывался |
| до 18 лет | 63 | 10 | 27 |
| 18 – 25 | 68 | 9 | 23 |
| 25 – 40 | 67 | 17 | 16 |
| 40 – 60 | 67 | 16 | 17 |
| более 60 | 74 | 5 | 20 |
| ВСЕГО | 67 | 12 | 21 |

Как видно из таблицы, доля респондентов выступающих за самостоятельное развитие Беларуси растет с возрастом. Если из числа опрошенных до 18 лет за самостоятельное развитие Беларуси 63%, то в возрасте более 60 уже 74%. Кроме того, группа опрашиваемых в возрасте более 60 демонстрирует наименьшее число противников самостоятельного развития – только 5%. Весьма вероятно, что это люди, которым довелось пожить не только при советской власти, и им есть с чем сравнивать. Самая высокая доля тех, кто не задумывался над этим вопросом среди молодежи – 27%, но эта цифра стремительно падает с возрастом. Видимо жизнь постепенно заставляет задумываться и вырабатывать свою точку зрения.

Последним вопросом в анкете был вопрос: «Как вы считаете, что можно сделать для возрождения белорусской культуры». Несмотря на то, что предложения были самые разнообразные все они, так или иначе вращались вокруг возрождения белорусского языка, белорусскоязычных школ и соответствующего воспитания молодежи. Вот наиболее распространенные ответы:

**- Нужно, чтобы все перешли на белорусский язык, в первую очередь в повседневной жизни.**
**- Чтобы больше развивался и укоренялся белорусский язык, открывались белорусские школы.**
**- Все печатные издания должны выходить только на белорусском языке.**
**- Нужно больше белорускоязычных ВУЗов и школ.**
**- Чтобы люди полюбили свой язык и культуру, а эту любовь надо воспитывать с детства.**
**- Проводить больше массовых мероприятий и культурных программ на белорусском языке о белорусской культуре.**
**- Практически ничего нельзя сделать, т.к. народ сам не стремится говорить на родном языке.**

При этом многие, в качестве мероприятия по возрождению белорусской культуры предлагали **повысить материальный уровень жизни. Нужно сказать, что действительно, нищенское существование меньше всего способствует мыслям о культуре и национальном самосознании.**

Подводя итог, можно с уверенностью утверждать, что население города Барановичи в большей своей части желает возрождения белорусской культуры и видит будущее Беларуси в самостоятельном развитии.

**В анкетировании участвовали студенты Барановичского филиала Белорусского института правоведения 2 и 3 курса бухгалтерского ф-та, 2 курса юристов. Анализ провел к.э.н. Гурский В.Л.**

Матэрыялы артыкула перададзены «Дзедзічу» нашымі баранавіцкімі аднадумцамі

# ХТО ПЕРАМОЖА?

## ДА ЎВАГІ МОЛАДЗІ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ!

У РАМКАХ ПРАЕКТА “БЕЛАРУСЬ МАЯ НЕПАЎТОРНАЯ” БЕРАСЦЕЙСКАЕ АБЛАСНОЕ МОЛАДЗЕВАЕ ГРАМАДСКАЕ АБ’ЯДНАННЕ ДАСЛЕДЧА-АНАЛІТЫЧНЫ КЛУБ “ДЗЕДЗІЧ” АБ’ЯЎЛЯЕ АБЛАСНЫЯ КОНКУРСЫ:

## Конкурс для маладых літаратараў

### “ТЫ Ў СЭРЦЫ МАІМ, БЕЛАРУСЬ!”

***Калі вам ад 14 да 25 гадоў, мы чакаем вашы творчыя працы на беларускай мове (у вершаванай альбо празаічнай форме) па адной з прапанаваных тэм:***

1. Святло кахання.
2. Горад, у якім я жыву.
3. Матуля мая, Беларусь!
4. Плач прыроды.
5. Людзі вакол нас.
6. Калі б прэзідэнтам быў я.
7. Я трапіў у мінуўшчыну (будучыню) у ... год.
8. Я, грамадзянін Беларусі, маю права?!
9. Беларусь – краіна бедных. Чаму і да якога часу?
10. Найбольш карыснае (шкоднае) вынаходніцтва ў гісторыі чалавецтва.

Прызы за лепшыя працы будуць уручаны па наступных намінацыях:

- за арыгінальнасць;
- за высокі мастацкі ўзровень;
- за прыгажосць мовы;
- за нацыянальны каларыт;
- за глыбіню зместу.

Акрамя таго, будзе ўручаны Гран-пры конкурсу за лепшы твор.

Пераможцы конкурсу і аўтары лепшых прац возьмуць удзел у літаратурным семінары, дзе сустрэнуцца з вядомымі пісьменнікамі Берасцейшчыны.

## АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЎСІХ КОНКУРСАЎ:

- працы альбо адказы на пытанні павінны адпавядаць тэме конкурсу;
- працы альбо адказы на пытанні павінны быць на беларускай мове;
- працы альбо адказы на пытанні павінны быць надрукаваны альбо напісаны разборлівым почыркам на пранумераваных лістах фармату А-4 з палямі не менш за 2 см, фармат фотаздымкаў – не менш, чым 10х15 (пажадана большы);
- колькасць творчых прац ад аднаго ўдзельніка не абмяжоўваецца;
- да працы альбо адказаў на пытанні на асобным лісце прыкладзіце наступныя звесткі: назва конкурсу; Вашы прозвішча, імя, імя па бацьку, хатні адрас, тэлефон, месца вучобы (працы).

## Конкурс для маладых аматараў гісторыі

### “МОЙ РОДНЫ ГОРАД У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ”

***Калі вам ад 14 да 25 гадоў, калі вас цікавіць мінулае роднага краю, мы чакаем вашы працы па гісторыі вашага горада ў перыяд ВКЛ.***

ПРЫЗЫ БУДУЦЬ УРУЧАНЫ АЎТАРАМ ЛЕПШЫХ ПРАЦ ЗА 1-е, 2-е І 3-е МЕСЦЫ.

ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ І АЎТАРЫ ЛЕПШЫХ ПРАЦ ВОЗЬМУЦЬ УДЗЕЛ У ГІСТАРЫЧНЫМ СЕМІНАРЫ, ЯКІ ПРАВЯДУЦЬ ВЯДОМЫЯ Ў КРАІНЕ НАВУКОЎЦЫ!

Пры напісанні працы трэба выкарыстоўваць некалькі гістарычных крыніц альбо навуковых твораў (памеры працы не абмяжоўваюцца)

* * *

## Конкурс для маладых мастакоў і фатографаў

### “БЕЛАРУСЬ МАІМІ ВАЧЫМА”

***Калі вам ад 14 да 25 гадоў, мы чакаем ад вас малюнкі ці фотаздымкі па адной з прапанаваных тэм:***

1. Людзі Беларусі.
2. Прырода Беларусі.
3. Гістарычнае мінулае Беларусі.

Прызы за лепшыя працы будуць уручаны па кожнай з пералічаных тэмаў.

Акрамя таго, аўтар лепшага твора атрымае Гран-пры конкурсу.

Пераможцы конкурсу і аўтары лепшых прац возьмуць удзел у працы аднадзённага майстар-класа для маладых мастакоў!

## Конкурс для навучэнцаў школ, гімназій і ліцэяў Берасцейскай вобласці

### “XXI ПЫТАННЕ З ГІСТОРЫІ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ”

***Калі вам ад 13 да 17 гадоў, калі вас цікавіць і прываблівае гісторыя роднага краю, мы чакаем вашы адказы на наступныя пытанні:***

I. Якія старажытнаславянскія і старажытнабалцкія плямёны жылі на тэрыторыі Берасцейскай вобласці ў раннім сярэднявеччы?

II. У склад якіх дзяржаў уваходзіў г.Берасце на працягу XII ст.?

III. Калі Берасце атрымала Магдэбургскае права, што гэта азначала для горада?

IV. Які Вялікі князь Літоўскі быў абраны адначасова каралём польскім на сойме ў г. Берасці і правіў абедзвюма краінамі на працягу паловы стагоддзя?

V. Як звалі ваеначальніка, які спаліў Берасце ў 1500г?

VI. Хто быў адначасова Берасцейскім старастам і канцлерам Вялікага княства Літоўскага?

VII. На якой мове надрукавана Берасцейская біблія?

VIII. Што такое “барацінкі”?

IX. Які ўладар ВКЛ упершыню запрасіў яўрэяў жыць у Берасці? Калі гэта адбылося?

X. Дзе нарадзіўся чалавек, які стаў апошнім каралём Рэчы Паспалітай?

XI. Калі Берасце было ўключана ў склад Расійскай імперыі?

XII. Які чалавек нарадзіўся ў 1748г. у в. Мерачоўшчына Косаўскага павета (зараз – Івацэвіцкі раён) і стаў нацыянальным героем ЗША і Польшчы?

XIII. Як звалі аднаго з кіраўнікоў паўстання 1862-63гг., які нарадзіўся ў маёнтку Шастакова Берасцейскага павета (зараз – Камянецкі раён) у 1825г?

XIV. Калі і чаму быў разбураны стары горад?

XV. Які славуты кампазітар і мастак нарадзіўся ў 1807г. у в. Варацэвічы Янаўскага павета (зараз – Іванаўскі раён).

XVI. Лёс якой знакамітай польскай пісьменніцы (творы яе перакладзены на больш як 30 моваў) звязаны з маёнткам Людвікава Кобрынскага павета?

XVII. Колькі разоў за ўсю гісторыю Брэсцкай крэпасці немцам даводзілася браць яе штурмам?

XVIII. Калі ў Брэст-Літоўску з’явілася чыгунка?

XIX. Якое ваяводства Другой Рэчы Паспалітай было самым вялікім па плошчы?

XX. Як называўся самы лепшы да Другой сусветнай вайны кінатэатр у Берасці?

XXI. Калі быў зняты першы дакументальны фільм пра Берасцейшчыну, які ўзнагароджаны срэбраным медалём на кінафестывалі ў Венецыі ў 1936г.?

Прызы будуць уручаны аўтарам лепшых адказаў за 1-е, 2-е і 3-е месцы. Пераможцы конкурсу возьмуць удзел у гістарычным семінары, які правядуць вядомыя ў краіне навукоўцы!

## ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСАЎ І АЎТАРЫ ЛЕПШЫХ ПРАЦ

- будуць запрошаны на фінальную частку конкурсу, дзе атрымаюць каштоўныя прызы;
- возьмуць удзел у турыстычнай вандроўцы “Па родных мясцінах” разам з пераможцамі іншых конкурсаў праекта “Беларусь мая непаўторная”;
- атрымаюць выніковы зборнік конкурсу “Беларусь мая непаўторная”, дзе будуць надрукаваны ўсе лепшыя працы.

Працы і адказы на пытанні прымаюцца да **15 ТРАЎНЯ 2001 г.!**

**УСЕ МАТЭРЫЯЛЫ ДАСЫЛАЙЦЕ НА АДРАС:**
**224000 г. Берасце, вул. Карбышава 112, кв. 4.**
**Тэл. для даведак: (0162) 20-31-21.**
**Прэс-служба ДАК “ДЗЕДЗІЧ”**

*Мой родны кут... (Я. Колас)*

# СЦЯГ над Бацькаўшчынай

У КАЖДОГО ЧЕЛОВЕКА В ДЕТСТВЕ БЫЛА МЕЧТА: КТО-ТО МЕЧТАЛ СТАТЬ КОСМОНАВТОМ, КТО-ТО – ЛЕТЧИКОМ, КТО-ТО – УЧИТЕЛЕМ... К СОЖАЛЕНИЮ, НЕ ВСЕ НАШИ МЕЧТЫ СБЫВАЮТСЯ. МНЕ В ЭТОМ ОТНОШЕНИИ ПОВЕЗЛО БОЛЬШЕ ДРУГИХ. С МАЛЫХ ЛЕТ МНЕ СНИЛИСЬ ОСЛЕПИТЕЛЬНО БЕЛОСНЕЖНЫЕ ГОРНЫЕ ВЕРШИНЫ, СТРАХОВОЧНЫЙ ТРОС И ВЕРНЫЙ ДРУГ, НА КОТОРОГО МОЖНО ПОЛОЖИТЬСЯ В ТРУДНУЮ МИНУТУ. И ВОТ МОЯ МЕЧТА СБЫЛАСЬ!..

Давно я хотел побывать на горе Дзержинская. Как! Вы не знаете, что это такое и где? Объясняю: гора Дзержинская – высочайшая точка Беларуси (345м над уровнем моря), находится достаточно недалеко от Минска. И вот, уговорив четырёх человек (в том числе и себя) – трёх парней и одну девушку в необходимости покорения этой вершины и взяв на себя бразды правления, я возглавил эту маленькую экспедицию.

Отъехав из Бреста на электричке Брест-Минск, около 12 часов ночи мы высадились в Фаниполе и решили поискать место для ночёвки в ближайшем лесу, который на поверку оказался местным кладбищем. Пришлось продолжить поиски.

На утро мы начали продвижение к нашей цели. Честное слово, горным козлам даже и не снились те пируэты, которые выделывали мы, карабкаясь по холмам - до горы Дзержинской оставалось пару километров. Гора Дзержинская (см. фото) – тригонометрический пункт среди разбросанного сена, железа и находящегося рядом ангара. «Нелегкое восхождение» завершилось 25 марта триумфальным воздвижением бело-красно-белого флага – флага Белорусской народной республики. В День независимости наш национальный стяг снова гордо реял над просторами “зямлі пад белымі крыламі”.

Наутро нас ожидал долгий путь домой. Протопав по дороге примерно 15 км, мы сели на автобус, который довез нас до Минска. Сев на обратную электричку Минск-Брест в 12 ночи, мы сразу же отрубились и проснулись уже в Бресте.



**«Бел-чырвона-белы» лунае над краінай**

**Двуликий Дикий**

## ДАПАМОГА - СПРАВА БЛАГАРОДНАЯ

ЁСЦЬ У СЯРЭДЗІНЕ ЕЎРОПЫ, ПАКРЫТЫ ЗЕЛЕННЮ, ГАРАДОК ТАКІ ПАД НАЗВАЙ БЕРАСЦЕ. І ЁСЦЬ У ГЭТЫМ ГАРАДКУ ЦЭНТР ПА РЭАБІЛІТАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ-ІНВАЛІДАЎ – “ВЕДА” НАЗЫВАЕЦЦА.

І вось аднойчы Цэнтру гэтаму дапамога спатрэбілася.

А справа вось у чым: сады і паркі гарадка нашага пачалі паступова пераўтварацца ў берасцейскае “Поле цудаў”, дзе ў якасці прызоў – смецце, смецце і смецце. І звярнуўся Цэнтр да моладзевых аб’яднанняў: ”Дапамажыце, родныя! А ўзнагародай вам будзе прыгажосць і чысціня вуліцы, удзячнасць ды добрае слова ад нас”.

І адгукнулася моладзь на кліч і разам узялася за працу. А было той моладзі – “Расток” ды “Дзедзіч”. Астатнія, мабыць, не пачулі, а можа ў іх былі справы пасур’ёзней.

І вынік сапраўды уразіў і ўдзельнікаў, і наведвальнікаў ды й звычайных прахожых – так пахарашэла ўсё навокал. Вось так, дапамагаючы адзін аднаму, мы здолеем упрыгожыць наш горад, нашу краіну і наша жыццё, каб самім было хораша, да і гасцей не сорамна запрасіць.



**Ударная брыгада «Дзедзіча»**

**Андрэй Ляўчук**

## ДАРЭЧЫ

Трымае расеец іспыт па бел. мове, а ягоны свядомы беларускі таварыш яму з дрэва, што каля вакна аўдыторыі, падказвае:

Выкладчык (В): «Як называецца першы месяц году?»

Беларускі таварыш (БТ) пачынае трэсціся, робячы выгляд, што яму мярзотна.

Расеец (Р): «Студзень»!

В: «Слушна... А як завецца восьмы месяц?»

БТ робіць выгляд, што жне сярпом.

Р: «Жнівень!»

П: «Так, жнівень... А як адзінаццаты месяц?»

БТ шапоча: «Лістапад! Лістапад!» - але сябра ня чуе. Тады пачынае трэсьці дрэва і падае з яго на зямлю.

Р: «Падзень? Не, мабыць ужо трупень...»

***

Калі хочаш быць шчаслівым адну хвіліну - папалі.
Калі хочаш быць шчаслівым адзін дзень - напейся.
Калі хочаш быць шчаслівым адзін месяц - ажаніся.
Калі хочаш быць шчаслівым усё жыццё - будзь здароў.

***

У Навінках пацыенты глядзяць «Рэзананс» па БТ. Адзін з іх пасля кожнага сюжэту пляскае ў далоні й радасна ўскрыквае:

- Добра, што я ў псіхушцы!

- Гэтага ўжо можна, дарэчы, выпісваць, - кажа адзін урач іншаму, - ён відавочна ачуняў...

## АБ’ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня “Дзедзіч” шукае распаўсюджвальнікаў бюлетэня ў навучальных установах Берасцейскай вобласці.
Тэл. (0162) 20-31-21.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.
Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 20-31-21**

№ 2 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
красавік 2001

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

ДАК "ДЗЕДЗІЧ" СКЛАДАЕ ПАДЗЯКУ ЦЭНТРУ "ВЕЖА" ЗА АКАЗАНУЮ ДАПАМОГУ

**Заснавальнік** - Берасцейскае абласное моладзевае грамадскае аб'яднанне **Даследча-аналітычны клуб "ДЗЕДЗІЧ"**
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк** 17.04.2001 года ў 18-00
**Наклад** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Б. Дэпеша.
**Рэдакцыйная калегія:** Я.Берасцейская, Д.Раманоўская, У.Тарноўскі

**Кантактны тэлефон:** 20-31-21
**E-mail:** dzedzich@mail.ru